ЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЫЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

4 (1211) | ПАНЯДЗЕЛАК, 20-га кастрычніка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Агульна-гарадзкі сход комсамольскага актыву г. Менску,
ПРЫЗНАЧАНЫ НА 16-Х, АДБУДЗЕЦЦА 24-Х.
НА ПАВЕСТЦЫ ДНЯ:
1. Вынікі Кастрычнікаўскага пленуму ЦК ЛКСМБ (дакл. Палякоў)
Сход актыву адбудзецца ў памяшканьні клюбу Харчавікоў (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)
Пачатак сходу а 7-й гадзіне ўвечары. Білеты па РК КСМБ.
ЦК ЛКСМБ.



50 ВАГОНАЎ БУЛЬБЫ—ШАХЦЁРАМ УСЕСАЮЗНАЙ КАЧАГАРКІ

-УДАРНАМУ ...КАНАЦЬ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА

...асовае забясьпечаньне про...іх цэнтраў гароднінай—адна ...ейшых гаспадарча-палітыч...ач сёньняшняга дня.

...сёлета павінна накіраваць ...ныя пролетарскія цэнтры 1500 тысяч тон бульбы.

...рускі комсамол, па выкліку ...скай організацыі ЎсеЛКСМ, ... сябе абавязак—загатовіць ...віць сваімі сіламі 10 эша... ...бульбы пролетарам Масквы. ...нешні дзень у Маскву на...а 7 эшалёнаў, учора і сёнь...аўляюцца апошнія.

...уючы організацыі чырво...алёнаў справа в загатоўкай ...кай бульбы ў раёнах (Слуцак, ... інш.) кранулася з мёртвага ... Комсамольская ініцыятыва ...ыла мясцамі спаўшых за...ў.

...рыкладу організацыі двесяці ...ў для Масквы, шэраг ком...кіх організацый Віцебску, ...ва, Пухавіч наладжвалі ...ы і накіроўвалі іх у прамы... цэнтры—Маскву, Ленінград. ...шчаемая сёньня пастанова ...рыяту ЦК ЛКСМБ адзначае, ...тад організацыі комсамоль... ...алёнаў бульбы ўпаўне сябе ...у.

Выходзячы з гэтага, сакратарыят ЦК ЛКСМБ ухваліў дапамагчы адправіць шахцёрам усесаюзнай качагаркі—Донбасу 35 тысяч тон бульбы, загатовіць і адгрузіць да 1 лістапада сіламі комсамольцаў 5 комсамольскіх эшалёнаў, па 50 вагонаў кожны.

Комсамольскія організацыі тых раёнаў, дзе будуць організоўвацца эшалёны, павінны з усёй бальшавіцкай напорыстасьцю прыступіць да гэтай работы. Баявой задачы павінны быць паданы баявыя тэмпы.

Трэба прыцягнуць да гэтай работы ўсю комсамольскую організацыю і працоўную моладзь.

Загатоўчыя організацыі павінны аказаць усямернае садзейнічаньне комсамолу ў выкананьні гэтай баявой задачы.

Побач з гэтым трэба падкрэсьліць, што абмежавацца адпраўкай толькі 5 эшалёнаў ні ў якім разе нельга.

Трэба мобілізаваць усе свае сілы, каб выканаць да тэрміну пляны загатовак бульбы і накіраваць яе ў прамысловыя раёны.

Адгрузіць 250 вагонаў бульбы шахцёрам Донбасу—баявы абавязак ЛКСМБ.

...вой рабоце—баявыя тэмпы

...нова сакратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 19-X 30 году аб бульбазагатоўках

...ічачы, што організацыя комсамольскіх эшалёнаў з бульбай ...ву сябе апраўдала, ЦК пастанаўляе:

... У мэтах наданьня баявога тэмпу загатоўкам і адпраўцы буль...усе пункты, прапанаваць усім комсамольскім організацыям пры...мэтад організацыі спэцыяльных эшалёнаў ва ўсёй нарыхтоў...боце.

... Улічваючы асаблівую важнасьць сваечасовага здаваленьня ... Донбасу, узяць на сябе ініцыятыву організацыі 5 комсамоль...алёнаў бульбы ў Донбас. Гэтым самым дапамагаць хутчэйша...ананьню пляну нарыхтовак на Украіне (35000 тон) і ўсяго ...оўчага пляну наогул.

... Прапанаваць т. Рудніцкаму, разам з зацікаўленымі організа...прапрацаваць плян адпраўкі гэтых эшалёнаў.

... Прапанаваць РК забясьпечыць баявыя тэмпы нарыхтоўкі буль...грузкі.

Зводка аб ходзе організацыі эшалёнаў

...ханаўскім і Копыльскім ра...атоўчыя організацыі зла...адносяцца да загатовак буль... комсамольскіх эшалёнаў. У ...была праведзена нарада з ...рамі комсамольскіх ячэек ...ў, на якой былі разьмярко...эйсцы загатовак бульбы.

...ыбіне да гэтага часу няма ... в Белплодгародніны, што ...івае загатоўку. У Коханаве ...ілена да загатоўкі і пагрузкі бульбы ў вагоны, у Мсьціслаўлі таксама.

Чыгуначны колектыў ст. Ворша вылучыў і накіраваў комсамольцаў для пагрузкі, сваечасовай падачы і адпраўкі вагонаў. Акрамя гэтага колектывам вылучаны сквозныя комсамольскія брыгады для суправаджэньня комсамольскіх эшалёнаў.

Упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ **Лапіцкі.**

Плян організацыі пяці комсамольскіх эшалёнаў бульбы для Донбасу

Загатоўку і адпраўку эшалёнаў правесьці сіламі комсамольцаў з прыцягненьнем усёй колгаснай, батрацкай і бядняцка-серадняцкай моладзі, скарыстаўшы вопыт работы на адпраўцы комсамольскіх эшалёнаў для Масквы.

Загатоўку і адпраўку эшалёнаў сконцэнтраваць у наступных пунктах:

1. Калінкавічы—два эшалёны—100 вагонаў.
2. Гомель—два эшалёны—100 вагонаў.
3. Асіпавічы—адзін эшалён—50 вагонаў.

I. З пункту Калінкавічы першы эшалён (50 вагонаў) павінен адправіцца 24-га кастрычніка.

Дастаўляюць бульбу для яго наступныя раёны:

1) Калінкавіцкі—24-X усяго 20 вагонаў (10 Райкоопсаюз і 10 Спажыўкоопэрацыя);

2) Каралінскі р-н—усяго 10 вагонаў (Райкоопсаюз—5 ваг. і Спажыўтаварыства—5). Пагрузка на ст. Ельск;

3) Азарыцкі (23-X) усяго 20 вагонаў (Райкоопсаюз—10 і Спажыўтаварыства—10). Пагрузка на ст. Халоднікі і Аставкаў—23-X—30 г.

Другі эшалён—станцыя адпраўленьня Калінкавічы.

На 27-ае кастрычніка раёны дастаўляюць бульбу:

1. Калінкавіцкі—20 вагонаў (Райкоопсаюз—10 і Спажыўтаварыства—10). Пагрузка—27-га кастрычніка.
2. Жыткавіцкі—10 вагонаў (Спажыўтаварыства—5 і Райкоопсаюз—5). Адпраўка—26-X.
3. Капаткевіцкі—10 ваг. (Спажыўтаварыства—7 і Райкоопсаюз—8) Пагрузка 26-га.
4. Азарыцкі—20 ваг. (Райкоопсаюз—10 і Спажыўтаварыства—10). Пагрузка 26-X.
5. Каралінскі—10 ваг. (Райкоопсаюз—5 і Спажыўтаварыства—5) (26-X—30).

II. З пункту Гомеля першы эшалён павінен адправіцца 26-га кастрычніка. Дастаўляюць бульбу раёны:

1. Буда-Кашалеўскі—15 вагонаў (Спажыўтаварыства—10 і Райкоопсаюз—5). Пагрузка—25-X.
2. Уваравіцкі—30 ваг. (Спажыўтаварыства пагруж.—25 і Райкоопсаюз—5).
3. Хойніцкі—10 вагонаў (Спажыўтаварыства—7 і Райкооп. 3) Пагрузка 25-X—30 г.

Другі эшалён з пункту Гомеля адпраўляецца—30-X-30 г.

Дастаўляюць раёны:

1. Буда-Кашалёўскі—15 ваг Спажыўкооп.—29-X—30 г.
2. Уваравіцкі—15 вагонаў. Спажыўкооп.—29-X-30 г.
3. Хойніцкі—10 ваг. (Спаж.—7 і Райкооп.—6)—28-X—30 г.

Трэці эшалён адпраўляецца з пункту Асіпавічы 26 кастрычніка.

Дастаўляюць бульбу наступныя раёны:

Любаньскі—15 вагонаў. Райкоопсаюз—25-га кастрычніка (на ст. Урэчча).

Старобінскі—20 ваг. Спажыўкоопэрацыя—25-га кастрычніка.

Старыя Дарогі—10 ваг. Райкоопсаюз—25-га кастрычніка.

Чырвона-Слабодскі—5 ваг. Райкоопсаюз—25-га кастрычніка.

Раённым камітэтам комсамолу вышэйпералічаных раёнаў, дзе будуць праходзіць загатоўкі і адпраўка комсамольскіх эшалёнаў на Донбас, патрэбна зараз-жа зьвязацца з загатоўчымі організацыямі і разам з імі мобілізаваць усю грамадзкасьць на выкананьне ў вызначаныя тэрміны пагрузкі і адпраўкі патрэбнай колькасьці вагонаў з бульбай, каб забясьпечыць сваечасовую адпраўку эшалёнаў. Мобілізаваць усю комсамольскую організацыю, прыцягнуўшы беспартыйную працоўную моладзь на выкананьне гэтага мерапрыемства.

Упаўнаважанымі ЦК ЛКСМБ па адпраўцы эшалёнаў з Гомеля, Калінкавіч і Асіпавіч зацьверджаны сакратары РК: па Гомелі—т. Пацукоў, па Калінкавічах—тав. Калінковіч і па ст. Асіпавічы—т. Якубовіч, якім прапануецца прасачыць за сваечасовай пагрузкай і адпраўкай эшалёнаў.

Усім раённым камітэтам, у абсягу дзейнасьці якіх загатаўляюцца эшалёны, сваечасова інформаваць ЦК ЛКСМБ і „Чырвоную Зьмену" аб выкананьні, загатоўцы і адпраўцы эшалёнаў.

Зьвязацца на мясцох, у раёнах, з украінскімі брыгадзірамі, з якімі організаваць усю работу па пагрузцы і адпраўцы эшалёнаў.

Нарады ўзгоднены з організацыямі: Белплодгародніна, Белпалявод-саюзам і Белкоопсаюзам, аб чым кожнаму з іх даслана адпаведная дырэктыва аб дапамозе ў гэтай рабоце.

ЦК ЛКСМБ.

Эшалён бульбы—пролетарскай Маскве—падарунак комсамолу Койданаўшчыны

Койданава, 18. Уноч з 19 на 20 кастрычніка са ст. Негарэлае, Койданава і Фаніпаль адпраўлены комсамольскі эшалён бульбы маскоўскаму пролетарыяту.

Эшалён організаваны сіламі комсамольскай організацыі Койданаўскага раёну ў сувязі з падрыхтоўкай к X райконфэрэнцыі ЛКСМБ.

Сакратар РК **Вайнштэйн.**

Выканаць дырэктывы ЦК аб мобілізацыі ўсіх комсамольцаў на капаньне бульбы

Уборка бульбы па Пухавіцкім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. На сёньнешні дзень плян уборкі бульбы выканан толькі на 15-20 проц. Райком комсамолу і комсамольскія ячэйкі бязьдзейнічаюць. Ня гледзячы на дырэктывы ЦК аб мобілізацыі комсамольцаў на дапамогу ўборцы бульбы, ні райком, ні ячэйкі нічога не зрабілі.

Неабходна тэрмінова прыняць меры да разгортваньня комсмольскімі ячэйкамі практычнай працы па дапамозе колгасам. **Вышня.**

Вінаватых прыцягнуць да адказнасьці

Плешчаніцы, 18.—(ад нашага юнкора).—Да гэтага часу ў справе бульбазагатовак па Плешчаніцкім і Лагойскім раёнах пануе галавацяпства. Так, напрыклад, 15-га кастрычніка сяляне вёскі Церахаўкі, Лагойскага р-ну, прывезьлі ў м. Плешчаніцы 30 вазоў бульбы, накіраваныя Лагойскім райспажывецкім таварыствам, тады як Плешчаніцкага р-ну ў Лагойскі накіроўваецца бульба на крухмальны завод.

Слухай, юнкорыя!
Сёньня 20 кастрычніка а 6-й гадзіне адбудзецца
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ НАРАДА ЮНКОРАЎ
з наступнай павесткай дня: 1. Удзел юнкораў у падрыхтоўцы да 3-га году пяцігодкі і X-га зьезду ЛКСМБ, 2. Аб дзейнасьці юнкораўскіх заметак. Пасьля нарады—паход у кіно.
ТВАЯ ЯЎКА АБАВЯЗКОВА. РЭДАКЦЫЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ"

Ізноў чутны акорды халтуры

Адгарадзіўшыся ад жыцьця, Музтэхнікум на... „стаканчиках граненых“ рыхтуе музыкаў, сьпевакоў чужое соцыялістычнаму будаўніцтву ідэолёгіі

Заціск самакрытыкі стаў мэтадам барацьбы з студ... тамі, якія ўзьнімаюць голас протэсту супроць квітнеючай у тэхніхуме халтуры

МЫ З УСЁЙ КАТЭГОРЫЧНАСЬЦЮ ПАТРАБУЕМ АД НКА І ГАЛОЎМАСТАЦТВА ПРЫНЯЦЬ УРЭ... РАШУЧЫЯ ЗАХАДЫ ДА АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ РАБОТЫ МУЗТЭХНІКУМУ

„... Сапраўды, нашыя рабочыя і сяляне заслугоўваюць чагосьці большага, чымся відовішчаў. Яны атрымалі права на сапраўднае вялікае мастацтва“.

У. І. ЛЕНІН—КЛАРЫ ЦЭТКІН.

Некалькі раз на старонках друку ўзьнімалася пытаньне аб тым, што справа з мастацтвам і прасоўваньнем яго ў працоўныя масы пастаўлена надзвычайна дрэнна. **Нажаль, усе артыкулы ў прэсе, ускрываючыя недахопы ў гэтай галіне, прайшлі бясьследна.** Адпаведныя організацыі, якія павінны быць зацікаўлены гэтай справай, на сыгналы прэсы не адгукнуліся і, як відаць, нічога не зрабілі, каб сапраўды цалкам і поўнасьцю паставіць мастацтва на службу соцыялістычнаму будаўніцтву.

Таму мы сёньня ізноў прымушаны біць трывогу, каб мобілізаваць думку пролетарскай грамадзкасьці вакол пытаньняў мастацтва, у прыватнасьці музычнай асьветы, і пропаганды сярод рабочых мас патрэбных сучаснаму этапу соцыялістычнага будаўніцтва музычных твораў.

Беларускі Музычны Тэхнікум павінен быць апорай, вогнішчам беларускай пролетарскай музыкі. Тэхнікум павінен выхоўваць музыкаў-змагароў за пролетарскае мастацтва. Між тым, пры сучасным кіраўніцтве і парадках у тэхнікуме, ён з гэтымі абавязкамі не спраўляецца.

Па волі хваль

Пасьпяхоасьць выкананьня тэхнікумам баявых задач па выхоўваньню ў сваіх лябораторыях пролетарскіх па духу людзей у значнай ступені залежыць ад разгортваньня штодзённай, сапраўды бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі сваёй работы. Аднак, шэраг прыкладаў сьведчыць аб тым, што самакрытыка ў тэхнікуме не ўпашане. Калі, напрыклад, студэнт Кухараў падаў у кіраўніцтва тэхнікуму заяву, у якой ён выказвае нездавальненьне пастаноўкаю работы ў тэхнікуме, дык дырэктар тэхнікуму—тав Казакоў—не знайшоў нічога лепшага, як аслабаніць тав. Кухарава з тэхнікуму.

Уход з тэхнікуму тав. Кухарава, якога ведаюць працоўныя ня толькі Менску, але і ўсёй Беларусі—як добрага сьпявака, з найбольш сучасным рэпэртуарам, тлумачыцца выключна склаўшыміся вакол яго ў тэхнікуме абураючымі абставінамі.

... „Сьвядома зацiралі мяне з прычыны надзвычайна казённых, абыякавых, незацікаўленых адносін да мяне пэдагога па спэцыяльнаму прадмету. Другая, ня менш важная, прычына,—піша далей у сваёй заяве тав. Кухараў,—гэта злачыннае выдаткоўваньне галасавога матар'ялу ў сілу ўмоў жыцьця, што пагражае пагібельлю майму голасу, а тады я не патрэбен ужо буду ні тэхнікуму, ні грамадзкасьці, ні сабе“.

Тав. Кухараў—селянін, бядняк. Па галасавых даных ва ўмовах Беларусі досыць здольны. Ня гледзячы на гэта, Музтэхнікум і НКАсьветы не забясьпечылі Кухарава з матар'яльнага боку, не далі магчымасьць працягваць вучобу. Кухараву сыстэматычна не даручалі сур'ёзнай акадэмічнай работы (ансамблі, опэры, рэпэртуар і інш.).

У тэхнікуме зусім адсутнічае якая-б там ні была крытыка работы настаўнікаў і агульнай працы тэхнікуму. Настаўнік Сьцігенны расказаў, што за пяць год яго работы ў тэхнікуме ніхто з кіраўніцтва тэхнікуму ня цікавіўся яго работай, не рабіў яму ніякіх заўваг наконт мэтадаў выкладаньня. Такое становішча з усім настаўніцкім складам у тэхнікуме.

Работа ідзе самацёкам.

„Аб цудах і загробным жыцьці“

Ці вядзецца ў тэхнікуме якаянебудзь работа ў напрамку вывучэньня клясавага зьместу, соцыяльнасьці мотываў твораў вядомых композытараў? Гэта-ж адзін з галоўных момантаў работы тэхнікуму. Ніжэйпрыведзены факт дасьць на гэта яскравы адказ.

На запытаньне,—хто такі Бэтговэн, Чайкоўскі і шэраг іншых вядомых композытараў, у сэнсе ацэнкі соцыяльнага зьместу мотываў іх творчасьці, студэнты адказваюць:

„Адкуль нам гэта ведаць (!?). Аб гэтым нам нічога не гавораць“.

Гэты факт б'е трывогу, што з клясавым выхаваньнем у тэхнікуме надзвычайна дрэнна. Ня менш трывожным зьяўляецца і той факт, што за мінулы год сярод студэнтаў тэхнікуму было некалькі спроб на самагубства.

Студэнты ў інтэрнаце свой вольны час „убіваюць“ на абывательскае сюсюканьне аб тым, хто праваліўся на апошнім концэрце і разважаньні аб... загробным жыцьці і цудах. Гэта не анэкдот, а жудасная сапраўднасьць.

За вялікай цагельнай сьцяною...

Камэнтары непатрэбны

Між тым, іменна ў музыцы фронт пролетарскага мастацтва застаецца да гэтага часу разарваным, вярней кажучы—яшчэ не самкнутым. Іменна ў музыцы мы яшчэ не навучыліся распазнаваць зьместу, не навучыліся выкрываць і біць клясавага ворага. А гэта патрабуе, каб сярод студэнтаў тэхнікуму, як галоўнае, вялася глыбокая марксысцкая выхаваўчая работа.

Пустое месца

Дзе-ж грамадзкасьць тэхнікуму—партыйная ячэйка, комсамол і іншыя організацыі?

Адказ смутны:

Усё гэта ў тэхнікуме існуе юрыдычна, а фактычна нічога падобнага няма. Грамадзкія організацыі — на паперы. Факты замаху на самагубства студэнтаў нават не абгаварваліся на партыйнай і комсамольскай ячэйках. Няўжо-ж гэта прыватная справа тых, хто ня хоча жыць?

У насьценгазэце тэхнікуму часамі чутны бываюць ноткі крытыкі тэхнікумаўскіх парадкаў... Але ні на адну з заўваг, ні на адну з заметак, ніхто ў тэхнікуме не патурбаваўся рэагаваць. (Такі лёс і з артыкулам у „ЧЗ“ ад 5-га ліпеня 1930 году „Забыты вучастак“).

Жыцьцё тэхнікуму чарапашымі тэмпамі паўзе міма таго, чым жыве і пульсуе зараз наша краіна. Адозва ЦК УсеКП(б) рэалізуецца выключна выхадамі ў колгасы на дапамогу. Ударніцтва, соцспаборніцтва ўнутры тэхнікуму—усё гэта далёкія рэчы ад сапраўднага яго жыцьця.

Тэхнікум, які павінен быў цалкам зрасьціся з акаляючым жыцьцём, прайшоў міма антырэлігійнай работы ў час яўрэйскіх рэлігійных сьвят. Такі факт—не адзінкавы. Музтэхнікум, як асяродак, дзе павінны выхоўвацца праваднікі ў шырокія працоўныя масы „сапраўднага вялікага мастацтва“, не адчуваецца ў рабочых масах хаця-б гораду Менску.

Што, напрыклад, тэхнікум зрабіў у разьвіцьці карыснага пачыну газэты „Чырвоная Зьмена“ і групы музыкаў і сьпевакоў Бе... тру—„як слухаць і раз... зыку“, у асяродзьдзі раб... рабочае моладзі?—Нічога.

Халтура, халту... халтура!

У значнай меры дзяку...
што тэхнікум замураваўся...
сьценах, што тэхнікум...
куму, і не вядзе ніяк...
сярод рабочых мас,—на...
бочых клюбаў паўзе хал...
„Чырвоная Зьмена“ ...
аб шэрагу агіднейшых ф...
ў рэволюцыйнае сьвята,...
бочымі масамі і чырво...
прыежджыя халтуршч...
ваюць пад кабацкую м...
стушкі сумненнай якас...
канчики граненые“,
„кирпичики“, „дорогой...
і г. д. Вось што часьця...
няе савецкую сцэну.

Тэхнікум, разам з ...
касьцю, павінен быў р...
радзіць дарогу халтуры...
кую сцэну. Павінен! А...
нічога не зрабіў.

* *
*

Нарэшце пара ажыц...
думку Леніна, якую ён...
сваім лісьце да т. Кл...
Для музтэхнікуму тут ...
дзейнасьці. Бязумоўна,
сучаснай пастаноўц...
тэхнікум ня здолее ...
ускладзеныя на яго ...

Дзеля гэтага мы па...
шучых захадаў па аз...
тэхнікуму. Сыгналы пр...
раз павінны быць па...
нікумам, Наркомасьвет...
стацтвам і іншымі ор...

П. ...

Дзень ураджаю і колектывізацыі—дэкада ўдарнай працы

Наводле пастановы ЦК УсеКП(б), з 15-га па 25 кастрычніка праводзіцца дзень ураджаю і колектывізацыі. Надаючы вялікае політычнае значэньне пасьпяховаму правядзеньню гэтага дня, комсамольскія організацыі павінны неадкладна пераключыць практычную працу ўсіх зьвеньняў організацыі на правядзеньне наступных задач:

Разгортваньне масавай праверкі-агляду работы саўгасаў, колгасаў за пройдзены шлях вялікага соцыялістычнага будаўніцтва, праверкі практычнага ўдзелу комсамольскіх ячэек.

Мобілізацыю колгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас на замацаваньне дасягнутых посьпехаў у справе колгаснага будаўніцтва і ліквідацыю прарываў у правядзеньні асеньніх сельска-гаспадарчых кампаній.

Рашучую барацьбу з права-опортуністычнай практыкай, стаўкай на самацёк і „левымі“ перагібамі ў колгасным руху, шырока разгортваючы працу па організацыі колгасьнікаў, беднякоў і серадпякоў на організацыю масавага прыліву ў колгасы, выкананьне лёзунгу партыі—ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі і яшчэ большага ўзмацненьня саюзу рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства.

Праводзячы працу пад гэтымі лёзунгамі, ад комсамольскай організацыі Беларусі, а таксама і ўсёй рабоча-батрацкай, колгаснай і аднаасобнай бядняцка-серадняцкай моладзі патрабуецца максымальна мобілізаваць усю сваю энэргію, увесь свой бальшавіцкі энтузіязм на практычнае ажыцьцяўленьне гэтых задач.

Дзень ураджаю і колектывізацыі зьяўляецца для комсамолу Беларусі вялікай гістарычнай датай. Мы павінны праверыць сваю работу па правядзеньню колгасна-вытворчага паходу і прыйсьці к фінішу праводзімай комсамолам усебеларускай сьвінаводчай эстафэты. Гэта значыць, што ячэйкі комсамолу павінны падсумаваць і паказаць, што імі зроблена па выкананьню дырэктыў партыі ў галіне разьвіцьця сьвінагадоўлі. Паказаць наколькі райком і ячэйкі ў сваёй практычнай дзейнасьці выканалі лёзунг сапраўднага павароту тварам да колгаснай вытворчасьці.

Ня губляючы ніводнае хвіліны, райкомы і ячэйкі павінны зараз-жа організаваць масавую справаздачнасьць колгасаў перад колгасьнікамі і аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства, выкарыстаўшы гэтыя справаздачныя сходы для популярызацыі сярод іх дасягненьняў колгасаў, яшчэ большага набліжэньня іх да колгасаў і організацыі новага прыліву ў колгасы.

Комсамольскія ячэйкі павінны дапамагчы колгасьнікам організаваць гэтыя сходы, вылучаючы з комсамольцаў і моладзі брыгады па масавай праверцы працы колгасаў. Праверыць наколькі ў колгасах соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва зьявілася асноўным мэтадам у працы. Падсумаваць гэтыя дасягненьні і распаўсюдзіць лепшыя ўзоры працы па ўсіх колгасах і саўгасах. Організаваць для гэтага масавыя колгасныя і раённыя зьлёты ўдарнікаў колгасьнікаў, правёўшы іх пад лёзунгам 100 проц. уцягненьня колгасных мас ва ўдарныя брыгады, за організацыю сустрэчнага пляну, за правільную організацыю працы ў колгасах, за ўсямернае ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны і рашучую барацьбу з безгаспадарнасьцю.

Комсамольскія камітэты і ячэйкі павінны мобілізаваць усе магчымасьці і сілы на дапамогу колгасам у сканчэньні ўборкі, асеньняй сяўбы і забясьпечыць выкананьне пляпаў асеньніх сельска-гаспадарчых кампаній. Мобілізаваць масы комсамольцаў і працоўнай моладзі на практычны ўдзел у праводзімай масавай усебеларускай дзесяцідзённай генэральнай праверцы. Выканаць да тэрміну ўзяты абавязак—нарыхтаваць ініцыятывай комсамолу 10 эшалёнаў бульбы маскоўскім пролетарам. Шырока разгарнуць працу па датэрміновай здачы сельска-гаспадарчага падатку, па зборы пайвых пляцяжоў і розных ссуд, вярбоўцы новых укладчыкаў у ашчадкасы і актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“.

Комсамольскія орга...
ду, разам з профсаюз...
тыйнай рабочай модз...
ны дапамагчы вясковы...
гэту вялікую політычну...
Трэба каб гарадзкія к...
організацыі на працягу...
паслалі ў вёску рабочы...
усклаўшы на іх задачу...
правядзеньні для ўра...
тывізацыі, перадачу ле...
раў працы па разгор...
спаборніцтва і ўдарніц...
стаўшы для гэтага ра...
ўдарнікаў-колгасьнікаў
чыўшы іх правядзеньн...
раўніцтвам.

Пасьпяховае выкана...
тых мерапрыемстваў бу...
выключна ад таго, на...
мольскія організацыі з...
пераключаць сваю прак...
цу і здолеюць мобілізав...
ці рабоча-батрацкай, кол...
няцка-серадняцкай мо...
пастаўленых задач. Уд...
ноўкай працы мы здол...
пастаўленыя партыяй ...
днём ураджаю і кол...
забясьпечым масавы пр...
ка-серадняцкіх мас у к...
нясем руйнуючы ўдар ...
яго агентах у шэраг...
комсамолу.

Барацьба за політэхнізацыю працягваецца

…рацягваючы рашучую барацьбу за політэхнічную школу, супроць опортуністых, якія зрываюць …раву політэхнізацыі, будзем упарта прасоўваць у масы рашэньні політэхнічнага зьезду, змагаючыся за хутчэйшую рэалізацыю іх

Паміж небам і зямлёю

…сё было ціха…

…СНГ спакойна адпачываў на …рах. Політэхнізацыя школы была …нута і мала хто дбаў аб ёй. Ад… кадраў ВСНГ, уключыўшы ў … пяцігодку кадраў ЦІП, як га…ую машыну, якая павінна даць …шую палову падрыхтаваных …аў, мірна заснуў. ЦІП вывезе! …далёк пачуліся гудкі політэхніч… зьезду.

…ачалася перапіска… Звычайнае …кідваньне паперамі, цыркуляр… завіруха.

…раба-ж рыхтавацца да зьезду!

…у выкананьне пастановы СНК …эорганізацыі трэцяга концэнтру … соцвыху ў тэхнікумы ці ФЗВ, …ыдыум Дзяржпляну ўхваліў пе…ць у падлегласьць ВСНГБ трэ… концэнтры ніжэй пералічаных …, для рэорганізацыі іх у тэх…мы, ці ФЗВ (ідзе пералічэньне …). Аддзел кадраў ВСНГ БССР …айго боку лічыць неабходным …ганізаваць гэтыя концэнтры ў …ы ФЗВ па наступных галінах …ысловасьці…“ (З адносіны …Г БССР ад 15 верасьня за …251 12 на імя загадчыка шко… імя Чарвякова).

…к рашае аддзел кадраў ВСНГБ, …та было 15 верасьня. У гэты …ь а 6-й гадзіне ўвечары па…я першы ўсебеларускі політэх…ы зьезд.

…радстаўнікі ВСНГБ, хоць і сла…дзел прымалі ў зьезьдзе, усё-ж …целі даць шэраг урачыстых …паваньняў.

…Далей?—Далей Скурсындыкат …уллецца прыняць прымацаваны …го трэці концэнтр менскай шко…мя Чарвякова. ВСНГ вядзе пе… прамысловасьці? Гарсавет пастанавіў узяць Хэмпрофшколу імя Чарвякова ўмоўна на мясцовы бюджэт.

Такім чынам школа працуе ўжо 47 дзён умоўна. Кідаліся школай, як футбольным мячом, пакуль не зрабілі яе ўмоўнай. Сродкаў пакуль што не далі ні граша. А бяз сродкаў нельга наладзіць лябараторыі, колькаснага і якаснага аналізу“.

Як бачым, школа засталася без абсталяваньня і магчымасьці весьці заняткі. ВСНГ ня вызначыў нават ухілу школы. Яна працуе без пляну. І ня дзіва, што 16 вучняў ужо пакінулі яе.

У ВСНГ ізноў ціха…

Праўда, у друку шмат пісалася аб гэтым. У „Чырвонай Зьмене“, „Зьвязьдзе“ і „Савецкай Беларусі“ неаднокраць пісалі аб фактах абураючага бюрократызму, але бюрократы моцна храпуць пад мерны шолах папераў.

Такім чынам, гэтыя школы да НКА ўжо не датычацца. ВСНГ прыняў і адмовіўся, гарсавет узяў умоўна на бюджэт. А далей?

А далей мы ставім пытаньне аб спыненьні гэтай ганебнай валынкі.

Мы лічым вышэйшым рэкордам валакіты і бюрократызму такія адносіны да політэхнізацыі школы і падрыхтоўкі кадраў.

Адначасова з гэтым мы ставім пытаньне аб хутчэйшай рэорганізацыі Хэмпрофтэхшколы ў ФЗВ, бо профшкола, як тэткая, аджывае свой век і ня можа задаволіць тыя патрэбы, якія прад'яўляюцца соцыялістычнай прамысловасьцю.

Нам патрэбны ўсебакова падрыхтаваныя кваліфікаваныя кадры, а не сурогаты ЦІП'у, ня людзі выхаваныя ў духу вузкага профэсыяналізму.

Пасьля політэхнічнага зьезду

Опортуністы: Бывалі дні гарачыя,
А зараз адпачнем…

…каплю і заўпэўнівае школу, што …ў будуць. Калі-ж Скурсындыкат …ным дакумантам катэгорычна …йся прыняць школу, ВСНГ …ткова згаджаецца з ім і ў …чарку адмаўляцца ад школы, …вярджаючы сваё рашэньне зго… …адзенай Дзяржпляну.

…адчык школы Цмыг пі… Школа засталася без гаспада… …хто яе не бярэ на бюджэт. …бюджэт ужо складзены і Хэм…школу на дзяржбюджэт не … НКА адсылае яе на мясцовы …т. Менскі гарсавет паставіў …не: чаму іменна Менскі (?!) …ет павінен утрымліваць проф… …, куды набраны вучні з „г… …сі, якая павінна рыхтаваць …ая кадры для рэспубліканскай

Права-опортуністычная стаўка на ЦІП'аўскую падрыхтоўку, урачыстае абяцаньне ў дні зьезду і практычнае невыкананьне дырэктыў партыі ёсьць па сутнасьці злачынства, па якім трэба накіраваць руйнуючы агонь.

Політэхнічны зьезд прайшоў, але барацьба за політэхнізацыю працягваецца.

Мы зьвяртаемся да органаў ЦКК і НК РСІ з просьбай хутчэйшага высьвятленьня фактаў абураючага цяганіны, якая перарасла ў зьдзек над школамі, і прыцягненьня да суровай адказнасьці „герояў“ гэтай сумнай гісторыі.

Л. ГЛЕЗЭР.

ЦКАВАНЬНЕ ЛЕПШЫХ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Ня так даўно мы пісалі аб агіднейшых фактах вялікадзяржаўнага шовінізму ў гомельскай школе ФЗВ чыгуначнікаў. Зараз пачынаецца новая справа—цкаваньне лепшых інструктароў школы—у час, калі мы так даражым кожнай кваліфікаванай адзінкай.

Нясупынныя сыгналы з школы кажуць аб тым, што шматлікія камісіі, якія ўтвараліся па пытаньнях працы ФЗВ, не даводзілі справу да канца, ня выкрывалі глыбокай сутнасьці прарываў у ФЗВ.

Мы патрабуем ад гаркому КП(б)Б і комсамолу, ад колектыву рабочых заводу Ланцуцкага безадкладна заняцца справай ліквідацыі прарываў у ФЗВ, вылучыць кіраўнікамі ФЗВ лепшых рабочых, якія будуць па-сапраўднаму праводзіць у жыцьцё лінію партыі па выхаваньню кадраў.

Гомельская школа ФЗВ імя Дзяржынскага налічвае зараз каля 1000 вучняў. Школа ФЗВ павінна выхоўваць сапраўды пролетарскія, ідэолёгічна вытрыманыя, клясава-сьвядомыя і тэхнічна пісьменныя кадры. Але на справе мы бачым адваротнае.

У ФЗВ не выхоўваюцца адпавядаючыя патрабаваньням краіны кадры, бо іх калечаць, прывіваючы клясава-варожую ідэолёгію. Інструктарска-пэдагогічны пэрсонал не здавае ае свайму прызначэньню.

Напружаная атмосфэра чакае разрадкі

Атмосфэра ў школе ФЗВ надзвычайна напружана. Вучні не памятаюць дня, калі-б у майстэрнях паміж інструктарамі ня было лаянак і спрэчак, калі-б інструктары займаліся непасрэдна сваёй працай. „Чырвоная Змена“ і вучні неаднокраць узьнімалі пытаньне аб аздараўленьні школы, вызваленьні яе ад клясава-чужых элемэнтаў, зрываючых правіл нае выхаваньне моладзі і патрабавалі зьмены кіраўніцтва школы і часткі інструктарскага складу.

Трывожныя сыгналы „Чырвонай Зьмены“ цалкам пацьвярджаюцца. Партыйна-комсамольскія організацыі і органы РСІ неаднокраць займаліся вывучэньнем становішча школы ФЗВ. Па сыгналах „Чырвонай Зьмены“ ў лістападзе мінулага году былі зьняты з працы: загадчык вучнёўскімі майстэрнямі Шастаковіч, інструктар такарнага цэху Міхайлаў і інструктар кавальнага цэху Бакшын. Аднак справа ад гэтага не палепшылася і школа працягвала каціцца ў гнілое балота разлажэньня.

Організацыйныя вывады камісіі райкому партыі ў час аздараўленьня школы далі мала рэальнага палепшаньня. Ужо зараз мы маем новы, умела організаваны і замаскаваны, выбрык часткі інструктараў. Выбрык тых, хто ня лічыцца з масай вучнёўства, хто баіцца адкрыць перад вучнямі свой сапраўдны твар, прыкрываючыся шыльдай баязьні падрыву свайго аўторытэту.

У сувязі з пашырэньнем школы і значным павялічэньнем колькасьці вучняў паўстала неабходнасьць папоўніць яе інструктарскім пэрсоналам з рабочых заводу. Замест пэўнага і патрэбнага падбору інструктароў і абгаварэньня кожнай вылучаемай кандыдатуры, мы сустрэліся з хваробным і шкодным мэтадам бюрократычнага і абыякавага вылучэньня, што надзвычайна дрэнна адбілася на школе.

Школа грызьні і плётак

Асаблівa перашкаджаюць продукцыйнай працы школы напружаныя ўзаемаадносіны паміж інструктарамі, штодзённыя лаянкі, плёткі, грызьня, скандалы, падсежваньне і цкаваньне. Інструктар Кучынскі, у паданай бюро парт'ячэйкі заяве піша: — „Таварыш Катэрлі сваімі дзеяньнямі дыскрэдытаваў мяне як інструктара“—і тут-жа ніжэй гаворыць аб цэлым шэрагу нікчэмных плётак і прыкрых драбніц.

Калі справа даходзіць да падмацаваньня слоў фактамі, дык тав. Кучынскі гаворыць аб нейкай лямпачцы, якую тав. Філонаў сказаў яму выкруціць. Гэта ён лічыць за гіронічную прыдзірку. Падобныя рэчы фігуруюць ва ўсіх трох заявах, паданых у бюро ячэйкі, дзе можна сустрэць усё, аж да хатніх лаянак…

Заявы паданы. Цёплая кампанія чакаючы вынікаў весела ўхмыляецца, пацiраючы рукі і настойвае на стварэньні камісіі па расьследваньню памянёных у заявах фактаў.

Вылучаная з складу „цёплай кампаніі“ камісія, перагаварыўшы паміж сабою, бяз удзелу комсамольскай ячэйкі і мас вучнёўства, у вывадах „абсьледваньня“ адзначае:—„На падставе заяў Кучынскага, Кучынскага і Жукава на загадчыка вучнёўскімі майстэрнямі, сакратара парт'ячэйкі тав. Філонава і інструктара тав. Катэрлі факты пацьвердзіліся“(?!)…

„Камісія лічыць мэтазгодным для аздараўленьня і правільнай работы ў майстэрнях тав. Філонаву вынесьці вымову і зьняць з працы загадчыка майстэрнямі, а тав. Катэрлі зьняць з пасады інструктара“.

Гэта ўсё… І ні слова аб матывах і прычынах, на падставе якіх зроблены гэтыя вывады. Ні слова аб агідных заявах „трох“. Прычыны ганебнага бесчалавечнага цкаваньня лепшых інструктароў-партыйцаў крыюцца выключна ў тым, што тав. Катэрлі і Філонаў кожнаму інструктару адкрыта, у вочы, паказваюць на недахопы ў рабоце, на няправільнае тлумачэньне вучням тае ці іншыя справы, на няправільнасьці ў вытворчым навучаньні вучняў, на моманты не выхаваньня, а разлажэньня іх.

Тав. КАТЭРЛІ

І зусім не навіна, што такія людзі, як Жукаў Кушнэраў і Разумаў не падыходзяць да працы інструктароў і ні ў якім разе ня могуць ні па сваёй кваліфікацыі, ні па сваіх адносінах да вучняў застацца ў якасьці інструктароў.

Наша політэхнічная школа, якою зьяўляецца ФЗВ, патрабуе ўсебакова вырымаваных падрыхтаваных інструктароў, да якіх мы ні ў якім разе ня можам аднесьці інструктароў Жукава і кампанію.

57-гадовы юнак і энтузіясты

Букет „добрых выхавальнікаў і каштоўных працаўнікоў“ паставіў перад сабой абураючую мэту: выжыць з школы ФЗВ лепшага з лепшых—інструктара тав. Катэрлі, чаго і дабіваецца ўсімі няпраўдамі і ганебнымі спосабамі.

Тав. Катэрлі—гэта 57-гадовы энтузіясты, 57-гадовы юнак, партыец, улюбёнец тысячнай масы вучнёўства, адзін з старэйшых і адданейшых інструктароў школы ФЗВ,—працуе ў ёй з 23 га году. За кожны новы варштат, за кожны крок школы ўперад ён радуецца, як дзіцё. Ён хварэе душой за маленькі недахоп у яе рабоце і жыцьці. Ён—яе сапраўдны бацька.

Усе ўстаноўкі новых варштатаў складзены ім тав. Катэрлі,—самага кваліфікаванага чалавека, уся адказнасьць за правільнасьць іх установкі. Установкі трансмісіі ляжыць толькі на ім, яго пяроадка можна сустрэць на працы і ў выхадныя дні. У час водпуску, калі ўся школа была ў месячным адпачынку, тав. Катэрлі з некалькімі вучнямі працаваў па сартоўцы па ўстаноўцы новых варштатаў, каб к тэрміну скончыць яе, г. зн. скончыць да прыходу вучняў з водпуску.

Каб падарваць моцны, заслужаны тав. Катэрлі аўторытэт, кампанія зарваўшыхся інструктароў абвінавачвае яго ў прыёме ад вучняў дрэнна выкананых програмных работ.

Цкаваньне працягваецца

У лістападзе мінулага году „Чырвоная Зьмена“ пісала аб цкаваньні тав. Катэрлі і стварэньні вакол яго такіх умоў, пры якіх нормальнай працы быць ня можа. З таго часу прайшоў роўна год. Зараз паўтарылася мінулае і камісія „цёплай кампаніі“ вынесла пастанову, якая выклікала абураючую хвалю законнага протэсту з боку масы вучнёўства. Вучні заявілі:

— „Таварыш Катэрлі—гэта той-жа бацька. Яго мы цэнім, як працаўніка-выхавальніка і мы ўпэўнены, што калі яго зьнімуць з працы, дык школа ад гэтага нічога ня выйграе, а кваліфікацыя вучняў значна пацерпіць. Мы,—паўстаючы ва яго абарону,—абараняем інтарэсы школы і павышэньне сваёй кваліфікацыі, бо такога каштоўнага і настолькі кваліфікаванага інструктара, як тав. Катэрлі, у школе ФЗУ мы яшчэ ня маем і мець ня будзем. Зьняць з пасады інструктара тав. Катэрлі г. зн. угробіць работу ўсяго ФЗВ“.

Шкодніцтва ў падрыхтоўцы кадраў

Пастанову камісіі аб зняцьці з пасады інструктара тав. Катэрлі, у наш час шалёнай барацьбы за скарыстаньне кожнага сьвядомага чалавека, мы павінны разглядаць, як яўнае шкодніцтва ў справе падрыхтоўкі кадраў, як імкненьне клясава-варожых элемэнтаў сарваць работу школы. Толькі так можна расцэньваць выбрык кампаніі інструктароў і нявытрыманую, нічым не абгрунтаваную, пастанову „камісіі“.

Тав. Філонаў, рабочы вылучэнец, сэкратар парт'ячэйкі школы ФЗВ, інструктар такарнага цэху,—высунуты на пасаду загадчыка вучнёўскімі майстэрнямі. Ён, як адміністратар, вельмі вымагальны, ён патрабаваў ад кожнага інструктара добрага выкананьня сваіх абавязкаў, што зьявілася асноўнай прычынай і штуршком для цкаваньня і падрыву яго работы.

Тав. Філонава высунулі на пасаду загадчыка вучнёўскімі майстэрнямі, але ён добраахвотна ўзяў на сябе абавязак сумясьціць працу загадчыка з працай інструктара, што зрабіла непатрэбным прыём новага інструктара, для такарнага цэху, і з'эканоміла штогодна па 2.040 рублёў народных грошай. Ім-жа быў высунуты проэкт сыстэмы навучаньня на адным такарным варштаце 2-3 вучняў. Школьная рада ўхваліла гэтую сыстэму тав. Філонава, як вельмі каштоўную ва ўмовах вострага недахопу такарных варштатаў у школе.

Навучаньню вучняў тав. Філонаў аддае шмат увагі. Большую частку рабочага часу знаходзіцца ён сярод вучняў і ў справе павышэньня кваліфікацыі даў шмат карыснага.

Гаркому партыі і комсамолу, партыйна-комсамольскім колектывам трэба безадкладна ўзяцца за сапраўднае аздараўленьне школы, шляхам карэннай зьмены яе зблакрушыўшагася кіраўніцтва і часткі інструктарскага складу, якія ня здолелі справіцца з ускладзенымі на іх адказьнейшымі задачамі падрыхтоўкі і выхаваньня пролетарскіх кадраў, выхаваньня тысячнай арміі будучых спэцыялістых.

Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на аздараўленьне сям'і інструктараў, на паладжаньне нормальных узаемаадносін паміж імі, без чаго ня можа быць правільна пастаўлена навучаньне.

Трэба таксама абараніць лепшых інструктараў тав. Катэрлі і Філонава ад агіднага цкаваньня і стварыць належныя ўмовы для іх продукцыйнай і карыснай працы, якая цалкам накіравана на карысьць школы і дзяржавы.

Віт. Сідарун

Агіднейшае імкненьне—зьвярнуць „шыю“ самакрытыцы

Цівунчык: — Да, группировка здесь! И утверждать я смею,
Что самокритикой хотят создать развал..
„Ленінец“: — А вы хотели-бы втащить ее в подвал
И ручкой нежною в углу свернуть ей шею!
(Па Бязыменскаму)

У апошнія часы ў комвузе імя Уладзімера Ільліча Леніна выявіўся факт самага грубага заціску самакрытыкі і ганеньня на рабкора з боку паасобных комуністых партыйнага колектыву.

Гэты факт заслугоўвае асаблівай увагі, таму што ён адбыўся ў сьценах комвузу, партыйны колектыў якога на чале з сваім кіраўнічым органам павінен быць прыкладам для іншых колектываў ува ўсёй працы, у справе разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, у справе хуткага рэагаваньня на ўсе антыпартыйныя вылазкі.

Крыху гісторыі.

У траўні месяцы гэтага году рабкор Закрэўскі напісаў артыкул у комвузаўскую друкаваную газэту „Ленінец“, зьмест якога наступны:

> Батрачка Размысловіч паступіла судамойкай у сталоўку КУБ. Ня маючы месца для начлегу, яна зьвярнулася да комэнданта з просьбай зьмясьціць яе дзе-небудзь пакуль знойдзе сабе кватэру. Комэндант зьмясьціў яе ў пакоі, дзе жыве хатняя работніца т. Гаруновіч. Гаруновіч—член ЛКСМБ—загадала выкінуць на двор рэчы Размысловіч, што і было зроблена. „Пансьнцы“ Гаруновіч, бачыце, не спадабалася, што з яе хатняя работніцай будзе жыць часова судамойка комвузаўскай сталоўкі. Тав. Размысловіч пашла да прорэктара комвузу т. Цівунчык, а потым да самога рэктара—т. Саевіча. Апошнія ёй адмовілі ў дапамозе. Будучы комуністкай, Размысловіч зьвярнулася ў Фрунзэўскі РК КП(б)Б, але і ён адмовіў, таму што сакратар партколектыву—Новікаў—інформаваў райком што гэта проста буза.

Як бачыце, зьмест допісу характарызаваў зьдзекі над батрачкай-комуністкай з боку комсамолкі Гаруновіч, а таксама бюрократычныя адносіны з боку адміністрацыі комвузу да таварыша Размысловіч у справе прадстаўленьня ёй месца для часовага начлегу.

У сувязі з тым, што допіс адпавядаў сапраўднасьці, рэдакцыя газэты „Ленінец“ пастанавіла яго зьмясьціць. Допіс быў набраны, газэта была зьвярстана... Але ў друкарню зьявіўся Цівунчык. Прачытаўшы допіс, Цівунчык абурыўся. Якое права мае нейкі Закрэўскі крытыкаваць яго—Прорэктара ды яшчэ сябра рэдколегіі.

Карыстаючыся правамі адміністратара, Цівунчык гранку з допісам выкінуў, назваўшы газэту „паршывенькай“.

Такі ўчынак нельга інакш характарызаваць, як вылазку тыповага бюрократа, які адарваўся ад мас, які пляваць хоча на крытыку партыйнага друку.

На другі дзень аб гэтым агідным факце было даложана сакратару партколектыву тав. Новікаву. Ён прамаўчаў, бюро партколектыву не рэагавала. Зразумела—не бяз ведама рэктара Саевіча.

Тым часам Цівунчык працягваў сваю агідную справу. Ён не задаволіўся тым, што выкінуў артыкул, ён пачаў цкаваць аўтара допісу тав. Закрэўскага. Прайшоў невялікі час і Закрэўскаму выносіцца ў службовым загадзе вымова. Потым... потым Закрэўскі звальняецца з пасады комэнданта і накіроўваецца ў распараджэньне Акругкому КП(б)Б.

Цівунчык рад. Ад рабкора, які асьмеліўся яго крытыкаваць, ён асалабаніўся адным росчаркам свайго прорэктарскага пяра.

Бачачы, што бюро партколектыву маўчыць, рэдакцыя газэты „Ленінец“ на сваіх старонках б'е трывогу. Пад націскам рэдколегіі вылучаецца камісія. На сваім масавым паседжаньні ад 16-га кастрычніка, бюро партколектыву ў рэзолюцыі констатуе, што з боку Цівунчыка быў грубы заціск самакрытыкі, было ганеньне на рабкора Закрэўскага. Цівунчыку абвяшчаецца суровая вымова. Бюро лічыла неабходным зьняць Цівунчыка з адказнай пасады і накіраваць на нізавую працу.

На нашай думцы, такому заціскачу самакрытыкі, цкавальніку рабкораў, бюрократу—ня месца ў шэрагах КП(б)Б.

Але гэта яшчэ не канец. Рэктар Комвузу Саевіч, як галоўны абаронца Цівунчыка, парашыў абараняць яго пакуль не атрымае канчатковую перамогу. Пад яго рэктарскім націскам на другі дзень 17-га кастрычніка, склікаецца зачыненае „сакрэтнае“ паседжаньне бюро, на якім адмяняецца ранейшая пастанова і зноў вылучаецца камісія для расьследваньня справы. А калі будзе канец?

Мы спадзяемся, што справу да свайго лёгічнага канца давядзе агульны сход партколектыву Комвузу, які, ня гледзячы на асобы, узброіўшыся дзейнай бальшавіцкай самакрытыкай, зробіць належныя палітычныя і організацыйныя вывады і прыцягне да суровай партыйнай адказнасьці заціскачоў самакрытыкі, цкавальнікаў рабкора Закрэўскага.

Панкрат Смачны.

Гімн аб самакрытыцы

Я самокритике все гимны
Сегодня смело пропою...
Безыменский



У ВЫКАНАНЬНІ ЦІВУНЧЫКА

Кляса супроць клясы

Проэктуюць новую „эўропэйскую аграрную Антанту“

ПАРЫЖ, 18. „Тан“ паведамляе з Белграду, што французскі міністр гандлю Фляндэн раіўся з Юга-Слаўскім міністрам гандлю аб проэкце стварэньня „эўропэйскай аграрнай антанты“, якая накіравана, зразумела, супроць СССР, у прыватнасьці супроць савецкага экспорту.

Сяляне захапілі маёнтак абшарніка

ВЕНА, 18. Як паведамляюць з Бухарэсту, учора ў супольні Вэймекля (Бэсарабія) адбылося паўстаньне даведзенай да крайнасьці сялянскай беднаты. Сяляне захапілі маёнтак абшарніка і разбурылі яго дом. Прыбыўшыя жандармэры сялянне аказалі супраціўленьне. Жандары адкрылі страляніну: 4 сялян забіта, шмат паранена.

Мітрапаліт Шаптыцкі зварочваецца да насельніцтва

ВАРШАВА, 17. Масавыя арышты і вобыскі па Заходняй Украіне не спыняюцца. Тым ня менш, украінскія згоднікі левых жадаюць дагадзіць сваім польскім гаспадаром. Мітрапаліт Шаптыцкі склікаў конфэрэнцыю грэка-каталіцкіх біскупаў, на якой быў прыняты тэкст „пастырскага“ пасланьня да насельніцтва аб так званым украінскім „сабатажы“. Пасланьне гэтымі днямі будзе апублікавана.

Зачынены незалежныя профсаюзы

ВАРШАВА, 16. На распараджэньню ўлады ў Катавіцах (Верхняя Сілезія, вугальны і мэталюргічны цэнтр) закрыты так званыя незалежныя профсаюзы. У афіцыйным паведамленьні аб зачыненьні профсаюзаў указваецца, што „комуністыя, заваяваўшы ўплыў у гэтых профсаюзах, нераўлі іх на палітычныя і рэволюцыйныя рэйкі“.

Разгортваецца барацьба нямецкіх мэталістых

Паліцыя адкрыла агонь па рабочых

БЭРЛІН, 17. Учора, а палове 6-ай увечары, у Бэрліне адбылася магутная дэмонстрацыя бастуючых рабочых мэталістых, якую організавала рэволюцыйная профопозіцыя.

У Вэдынгу (пролетарскі цэнт Бэрліна) пачалі сьцягвацца калёны мэталістых з усіх раёнаў гораду. Па сканчэньню мітынгаў дэмонстрацыя накіравалася па вуліцах Вэдынгу.

„Калі частка дэмонстрацыі праходзіла Візэнштрасэ,—паведамляе „Ротэ Фанэ“,—сільны атрад паліцэйскіх нечакана адкрыў агонь. Адзін рабочы цяжка паранены ў калена, другому гумовай дубінкай праламілі чэрап. Потым паліцыя перашла да опозыцыйнай барацьбы. Паліцэйскія залеглі на скрыжаваньнях вуліц і абстрэльвалі іх. Усе вуліцы былі ацэплены паліцыяй. Сярод рабочых пануе надзвычайнае абурэньне. У другім пролетарскім раёне Бэрліна, у Нэйкельне, паліцэйскія напалі на дэмонстрацыі, накінуліся на рабочых оркестрантаў, папсавалі іх інструманты, арыштавалі 5 рабочых. Адзін рабочы цяжка паранены ў галаву гумовай дубінкай.

„Ротэ Фанэ“ заклікае бастуючых рабочых організаваць сёньня сход протэсту супроць паліцэйскага тэрору і патрабаваць, каб была ўбрана паліцыя з вуліц і прадпрыемстваў.

На сходах рабочых заводу „Трэст“ абраны рэволюцыйныя забастовачныя камітэты.

Да забастоўкі далучыліся ўсе рабочыя турбіннага заводу „А. Е. Г.“.

130.000 мэталістых бастуюць у Нямеччыне

БЭРЛІН. Па даным профсаюзу мэталістых бастуе 130.000 рабочых і работніц. На працягу аднаго дню лік бастуючых павялічыўся да 4.000 чалавек.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

Народны Камісарыят Асьветы паведамляе, што заметка „Варожы нам элемэнт азноўлен у тэхнікуме“ пацьвердзілася. Шалщеповіч з тэхнікуму выключан ў верасьні месяцы.

*

Тураўскі райінспэктарыят Асьветы паведамляе, што па заметцы „Хто ў школе вучыцца“ тры чалавекі выключаны з школы за антысэмітызм і шовінізм, а некалькі чалавек пакінулі школу самі пасьля патрабаваньня платы за навучаньне.

*

Сьмілавіцкі РК КП(б)Б паведамляе, што заметка „Старшыня колгасу—антысэміт“ цалкам пацьвердзілася. Пастановай бюро РК КП(б)Б прапанавана райколгассаюзу тэрмінова-перазабраць праўленьне колгасу.

*

Пухавіцкі райком комсамолу паведамляе, што факты, указаныя ў заметцы „Аздаравіць колгас“, пацьвердзіліся. Сокалаў выключаны з КСМ.

*

Талочынскі райком комсамолу паведамляе, што заметка „Больш клясавай зіркасьці“ цалкам пацьвердзілася. Райком комсамолу прыняў меры да аздараўленьня ячэйкі. Зьняты сакратар ячэйкі Хаткевіч з абвяшчэньнем суровай вымовы. Зараз абрана новае бюро. Ячэйка і райком КП(б)Б узмацнілі сваё кіраўніцтва.

*

Азарыцкі райком КП(б)Б паведамляе, што заметка „Барацьба з п'янкай“ пацьвердзілася. У адносінах тав. Пятрушка будзе стаяць пытаньне ў партыйным парадку. Адносна тав. Кавальчука факт не пацьвердзіўся.

*

Па заметцы „Слуцкія прарывы—узор па сьвінагадоўлі БССР“, зьмешчанай у „Ч. З.“, Слуцкі РК КП(б)Б паведамляе, што заметка пацьвердзілася. Распушчана бюро партячэйкі за бязьдзейнасьць у этай справе.

*

Чэрвеньскі райвыканком паведамляе, што заметкі: „Хутарскія галаваціны зрываюць сяўбу“ і „Каго абараняе Нарэйка“—пацьвердзіліся. Сэкратар кандыдацкай групы—тав. Каўтовіч зьняты з працы і выключаны з партыі. Т. Нарэйку вынесена вымова з папярэджаньнем. Старшыня сельсавету—тав. Шаланюк—зьняты з працы 1-VIII у Хутарскім сельсавеце зроблены перавыбары.

*

Пухавіцкі райвыканком паведамляе, што заметка аб Гольдзіне пацьвердзілася. Гольдзін выключан з сельскагаспадарчай арцелі імя Чарвякова, аднак РВК нічога не зрабіў каб выявіць дзе працуюць яго сваякі і дзеці.

Саракаградусн… падвяла...

Аб недахопах шклозавод… „…стрычнік“ ужо шмат піс… „Чырвонай Зьмене“, але ў… час замест паляпшэньня … мы назіраем значнае пагл… іх, і асабліва за лік … партыйцаў.

12 кастрычніка ня вы… працу Тарнецкі Франц—… рэдактар шматтыражкі „… Гутнік“ і Наронскі—сябра …

Прагулы гэтых таварыш… тлумачацца тым, што, будучы … слачах, яны не змаглі … прайсьці міма крамы Цэнтр… і сумесна з рабочым Кру… напіліся да страты сьвядом…

Партколектыў павінен … зрабіць адпаведныя вывады … гэтых партыйцаў-прагульшч…

Бя…

Папраўка

У № 241 „ЧЗ“ у … „Загатоўчыя організацыі ба… чаюць“, зьмешчанай на 1-… укралася памылка. Надр… „Да вызначанага тэрміну … налі плян на 50 проц. … адзінаасобнікі выканалі п… тоўкі бульбы на 10 проц… чытаць: „Плян выканалі … колгасамі недавыканан… проц., адзінаасобнік мі… пана 10 проц. бульбы“.

Паведамленьні

Кастрычніцкі РК ЛКСМБ … …е, што кустовыя сходы … …най організацыі ЛКСМБ … …ю справаздачы Райкому Л… будуцца наступным парадкам…

20-га кастрычніка а 11-й … …ніцы ў памяшканьні клюб… пас. ст. адбудзецца сход … наступных ячэек (працуючы… зьмене):

Абутковая ф-ка, „Энэргія“, …шавік“, „Крупская“, „Ударні…“, Чыгунка, „Пролетары“.

21-га кастрычніка а 7-… ўвечары ў памяшканьні клюб… пас. ст. адбудзецца сход … наступных ячэек:

„Чыгунка“, „Полымя Р…“, „Пролетары“, „Чырв. Хэмі…“, …спартны тэхнікум“, Саюзтр… …вых, АБВШ.

21-га кастрычніка а 7-… ўвечары ў памяшканьні клюб… асьветы адбудзецца сход 5… наступных ячэек:

Хэмфармзавод, Малочны…, „Ударнік“, ф-ка „Крупскай“, …прамсаюз, Белкоопсаюз, Фіз… Тэхнікум, 37-ы Конардзіў.

КАСТРЫЧНІКАВЫ РК…

Да ведама ўсіх …тываў і ячэек Л… Фрунзэўскага ра…

Фрунзэўскі РК ЛКСМБ … дзіць да ведама ўсіх кол… і ячэек, што ў панядзел… кастрычніка, а 6 гадзі… у памяшканьні райкому … ца нарада сакратароў і … масавых працаўнікоў кол… і ячэек па пытаньню … тоўкі да райконфэрэнцыі … молу.

Яўка абавязкова.

Бюро ФРК Л…

21-га кастрычніка, а 6… не ўвечары, адбудзецца п… пе ЦКК ЛКСМБ, на якое … юцца наступныя тавары… наў А., Сімкін Г., Крын… нюшчанка, Ардімовіч, Фі… Кісіна М., Нікалаевіч П. … кевіч І., Верапёнка А. … мовіч, Кукін, Пучкаеў Я. … новіч Д., Шаройкін Дзер… чаў В., Пісарэвіч М. П., … сон С., Ліповіч Р., Фа… лаўскі, Левітан, Каркеві… Кушнэр Х. С., Лінскі І. … віч Е. Я., Шыдоўскі П. … шчук, Міхальскі Я. В., … скі Я. А., Пяткова А. … Лінскі Я. Р. Іоффэ, Бедн…

Праезд за свой кошт.

ЦКК Л…

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел …